# Ракасоўскі Канстанцін Канстанцінавіч



**Дата нараджэння:** 9 (21) снежня 1896

**Дата смерці:** 3 жніўня 1968

**Месца нараджэння:** Польшча, г. Варшава

**Месца подзвігу:** БССР

**Дата подзвігу:** 1944

**Узнагароды:** двойчы Герой Савецкага Саюза (29.07.1944, 01.06.1945);
7 ордэнаў Леніна;
ордэн «Перамога»;
ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі;
ордэн Суворава I ступені;
ордэн Кутузава I ступені;
іншыя медалі;
ордэны Польшчы, Манголіі, Францыі.

**Ушанаванне ў Беларусі:** Брэсцкая вобласць: г. Баранавічы – вуліца, г. Драгічын – вуліца, г. Жабінка – вуліца, г. Пінск – вуліца, г. п. Целяханы – вуліца;

Гомельская вобласць: г. Жлобін – вуліца, г. Ельск – вуліца, г. Нароўля – вуліца, г. Рэчыца – вуліца, г. п. Лоеў – вуліца;

Гродзенская вобласць: г. Ваўкавыск – вуліца;

Магілёўская вобласць: г. Бабруйск – вуліца; Слаўгарад – вуліца, Чэрыкаў – вуліца;

г. Мінск – праспаект;

Мінская вобласць: г. Жодзіна – вуліца, г. Нясвіж – вуліца, г. Стоўбцы – вуліца, г. п. Радашковычы – вуліца;

**Ракасоўскі Канстанцін Канстанцінавіч** (9 (21) снежня 1896 – 3 жніўня 1968) – савецкі военачальнік, палкаводзец, Маршал Савецкага Саюза, Маршал Польшчы, двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945), удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

У арміі з 1914, у Чырв. гвардыі з 1917, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, баёў на Кіт.-Усх. чыгунцы (1929). Скончыў курсы ўдасканалення

камсаставу кавалерыі (1925) і вышэйшага начсаставу пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1929). Камандзір палка, брыгады, дывізіі (з 1930 на Беларусі), з 1936 кав. корпуса. У жніўні 1937 – сакавіку 1940 рэпрэсіраваны. З 1940 на камандных пасадах.

У Вялікую Айчынную вайну камандаваў корпусам, арміяй, войскамі Бранскага, Данскога, Цэнтральнага, з лютага 1944 – 1-га Беларускага, а з лістапада 1944 – 2-га Беларускага франтоў. Удзельнік Смаленскай бітвы (1941), Маскоўскай бітвы (1941–1942), Сталінградскай бітвы (1942–1943), Курскай бітвы (1943), Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі (1943), Калінкавіцка-Мазырскай, Рагачоўска-Жлобінскай, Беларускай аперацый (1944), Вісла-Одэрскай, Усходне-Прускай, Усходне-Памеранскай, Берлінскай аперацый (1945).

24 чэрвеня 1945 камандаваў Парадам Перамогі ў Маскве.

У 1945 – 1949 галоўнакамандуючы Паўн. групай войск. З 1949 міністр нац. абароны і нам. старшыні Савета Міністраў ПНР. З 1956 у СССР – нам. міністра абароны СССР (1956–1957, 1958–1962). У 1964 удзельнічаў у святкаванні 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у Мінску.

Маршал Савецкага Саюза (1944). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). Узнагароджаны ордэнам «Перамога», 7-ю ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 8-ю іншымі ордэнамі, медалямі, ордэнамі Польшчы, Манголіі, Францыі.

Аўтар мемуарных твораў «Няскораная Беларусь» (1963), «Сталінградская эпапея» (1968), «Курская бітва» (1970), і інш.

К. К. Ракасоўскі памёр 3 жніўня 1968 года, пахаваны на Чырвонай плошчы ў Маскве.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Владимиров, П.** Маршалу Рокоссовскому посвящается / П. Владимиров // Новополоцк сегодня. – 2016. – 16 дек. – С. 3.
2. **Галоўка, С. А.** Салдацкі абавязак маршала Ракасоўскага / Сяргей Галоўка // Беларуская думка. – 2015. – № 8. – С. 32–40.
3. **Гарелик, М.** Роль Белорусских фронтов в победе над фашистской Германией: факты, даты, фотографии / М. Гарелик // Архівы і справаводства = Архивы и делопроизводство. – 2020. – № 2. – С. 133–141.
4. **Дайнес, В.** Рокоссовский. Гений маневра / В. Дайнес. – М. : ЭКСМО, 2008. – 670 с. – (Маршалы Победы).
5. **Долготович, Б. Д.** Рокоссовский Констинтин Константинович : [Гомель] / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов : биогр. справочник. – Минск : Беларусь, 2008. – С. 130.
6. **ДОСЬЕ**: К 120-летию маршала Советского Союза Константина Рокоссовского. – Режим доступа: https://www.belta.by/society/view/dose-k-120-letiju-marshala-sovetskogo-sojuza-konstantina-rokossovskogo-224507-2016/. – Дата доступа: 20.11.2020.
7. **Дроздов, А.** От «Суворова» к «Багратиону» : начало освобождения Беларуси от немецко-фашистской оккупации / А. Дроздов // Беларуская думка. – 2013. – № 9. – С. 47–53.
8. **Кардашов, В. И.** Рокоссовский / В. И. Кардашов. – 3-е изд. – М. : Молодая гвардия, 1980. – 446 с. : ил. – (Жизнь замечательных людей).
9. **Комдив** Рокоссовский : Минская строка биографии маршала. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/komdiv-rokossovskiy.html. – Дата доступа: 20.11.2020.

10. **Константинов, К. Б.** Рокоссовский. Командующий Парадом Победы / К. Б. Константинов. – М. : Эксмо : Яуза, 2014. – 320 с. – (Имя Победы).

11. **Константинов, К. Б.** Рокоссовский. Победа не любой ценой / К. Б. Константинов. – М. : Яуза : Эксмо, 2007. – 320 с.

12. **Корольченко, А. Ф.** Маршал Рокоссовский / А. Ф. Корольченко. – М. : АСТ ; Ростов н/Д : Феникс, 1999. – 320 с. – (След в истории).

13. **Корольченко, А. Ф.** Маршал Рокоссовский [Звукозапись] : аудиокнига / А. Ф. Корольченко ; читает Л. Деркач. – Минск : Звукотэкс, 2016. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – (След в истории).

14. **Куманев, Г. А.** Великие стратеги XX века – Маршалы Победы Г. К. Жуков и К. К. Рокоссовский / Г. А. Куманев // Военно-исторический журнал. – 2012. – № 8. – С. 65–72.

15. **Лопарев, С.** Подарок маршалу Рокоссовскому / С. Лопарев // Армия. – 2009. – № 3. – С. 46–47.

16. **Лубченков, Ю. Н.** Константин Константинович Рокоссовский / Ю. Н. Лубченков // Самые знаменитые полководцы России / Ю. Н. Лубченков. – М., 2000. – С. 613–622.

17. **Канюта, В.** Маршал Перамогі: Канстанцін Ракасоўскі [Электронный ресурс] / В. Канюта. – Режим доступа: https://zviazda.by/be/news/20150511/1431292081-marshal-peramogi-kanstancin-rakasouski. – Дата доступа: 20.11.2020.

18. **Михеенков, С. Е.** Польский мундир Маршала Рокоссовского : гл. из романа / С. Е. Михеенков // Белая Вежа. – 2017. – № 5. – С. 9–21.

19. **Михеенков, С. Е.** Рокоссовский. Клинок и жезл / С. Е. Михеенков. – М. : Молодая гвардия, 2017. – 463 с. – (Жизнь замечательных людей).

20. **Михеенков, С. Е.** Рокоссовский. Клинок и жезл : роман-биография / С. Е. Михеенков // Наш современник. – 2016. – № 5. – С. 3–56 ; № 6. – С. 96–140.

21. **Ракасоўскі** Канстанцін Канстанцінавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945 : энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 521–522.

22. **Ракасоўскі** Канстанцін Канстанцінавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 87.

23. **Рокоссовский, К. К.** Солдатский долг / К. К. Рокоссовский. – М. : Воениздат, 1984. – 367 с. – (Военные мемуары).

24. **Рокоссовский** Констинтин Константинович // Их именами названы... : энцикл. справочник. – Минск, 1987. – С. 518.

25. **Рокоссовский** Констинтин Константинович // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биогр. справочник. – Минск, 2015. – С. 315.

26. **Рубцов, Ю. В.** Маршалы Советского Союза в истории России : гербы на погонах / Ю. В. Рубцов. – М. : Вече, 2015. – 304 с. – (Слава России).

27. **Рубцов, Ю. В.** О полководцах Великой Отечественной войны / Ю. В. Рубцов // Новая и новейшая история. – 2010. – № 3. – С. 62–70.

28. **Свистунов, И. И.** Из боя в бой : о К. К. Рокоссовском / И. И. Свистунов. – М. : Политиздат, 1979. – 78 с. – (Герои Советской Родины).

29. **Свистунов, И. И.** Сказание о Рокоссовском / И. И. Свистунов. – М. : Воениздат, 1982. – 341 с.

30. **Соколов, Б.** Когда родился Рокоссовский / Б. Соколов // Родина. – 2009. – № 5. – С. 14–16.

31. **Солдатский** долг Маршала Рокоссовского. – Режим доступа: http://www.warmuseum.by/index.php/yubilyary/578-soldatskij-dolg-marshala-rokossovskogo. – Дата доступа: 20.11.2020.

32. **Сульянов, А. К.** Непобедимые : док. повесть / А. К. Сульянов. – Минск : Маст. літ., 2014. – 501 с.

33. **Сухов, Ф.** Букет для маршала / Ф. Сухов // Планета: Беларусь и мир. – 2011. – № 7. – С. 68–77.

34. **Филимонов, А. В.** «Особая папка» на комдива К. К. Рокоссовского / А. В. Филимонов // Военно-исторический журнал. – 2006. – № 9. – С. 12–15.

35. **Чибисов, И.** Маршал двух народов / И. Чибисов // Армия. – 2012. – № 5. – С. 30–35.

36. **Шевченко, Н.** Война войной, а сев – по расписанию : как командующий 1-м Белорусским фронтом генерал армии Рокоссовский и «вся масса сержантов и солдат» помогали возделывать колхозные поля и индивидуальные огороды / Н. Шевченко, В. Пинчук // Чырвоны прамень (Чашнікі). – 2014. – 1 крас. – С. 3.

37. **Щукин, В. Т.** Полководцы Великой Победы / В. Т. Щукин. – М. : АСТ : Астрель, 2010. – 508 с. – (Историческая библиотека).

**Галоўка, С. А.** Салдацкі абавязак маршала Ракасоўскага / Сяргей Галоўка // Беларуская думка. – 2015. – № 8. – С. 32–40.



# Салдацкі абавязак маршала Ракасоўскага

**Сярод выдатных палкаводцаў, якія ўнеслі вялізны ўклад у Перамогу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, асаблівае месца належыць Маршалу Савецкага Саюза Канстанціну Канстанцінавічу Ракасоўскаму – чалавеку з вельмі няпростым лёсам. Пра яго жыццёвы шлях расказвае ў гутарцы з карэспандэнтам «Беларускай думкі» праўнучка Арыядна Ракасоўская, журналіст «Российской газеты», адзін з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў жыццяпісу знакамітага военачальніка.**

– Я нарадзілася праз дванаццаць гадоў пасля таго, як прадзеда не стала. У доме віселі яго партрэты, і з ранняга дзяцінства я проста ведала: гэта мой дзед Косця. Але аднойчы, мне было гадоў дзесяць, бацькі ўзялі мяне з сабой на прэм'еру фільма «Маршал Ракасоўскі. Жыццё і час». І як толькі прадзед паказаўся на экране, я як закрычу на ўвесь кінатэатр: «Гэта ж дзеда Косця! Дзеда Косця!» Мяне ледзьве супакоілі. Пасля фільма нас акружылі людзі, пачаліся роспыты. Тата быў мною тады вельмі незадаволены.

Калі мне было шаснаццаць, я прачытала лісты прадзеда, адрасаваныя жонцы і дачцэ. Іх вельмі многа. Гэтыя лісты мяне ўразілі сваёй сціпласцю: «Есть луга, поля, леса, поют соловьи. А нам с тобою больше ничего и не надо». Прачытала і ўлюбілася ў гэтага чалавека, стала вывучаць дакументы, чытаць тое, што пра яго напісана і што пісаў ён сам, размаўляць з тымі, хто яго ведаў. І адкрыла найперш для сябе шмат цікавага з жыццяпісу свайго прадзеда…

## Польска-беларускія карані

У афіцыйнай версіі біяграфіі маршала К. Ракасоўскага значыцца, што ён нарадзіўся 21 снежня 1896 года ў расійскім горадзе Вялікія Лукі ў сям'і чыгуначніка і настаўніцы: бацька, паляк па паходжанні, працаваў машыністам паравоза, маці, руская, выкладала мову і літаратуру ў школе. На самай жа справе будучы савецкі палкаводзец з'явіўся на свет у Варшаве. А Вялікія Лукі ў біяграфічных даных К. Ракасоўскага напісалі пасля таго, як у чэрвені 1945 года яму другі раз было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза і паўстала пытанне аб устаноўцы яго бронзавага бюста на радзіме. Ставіць скульптурную выяву легендарнага савецкага маршала ў замежнай сталіцы, няхай сабе і братняй сацыялістычнай Польшчы, было не зусім карэктна. Таму ваенным ідэолагам загадалі «падабраць» на тэрыторыі СССР месца, дзе б ён мог нарадзіцца.

– Кампетэнтныя органы, па ўсім відаць, грунтоўна вывучылі наш радавод, бо знайшлі неабходную ім зачэпку, – уводзіць у курс справы праўнучка маршала. – Яны выявілі, што ў сярэдзіне XIX стагоддзя недалёка ад Вялікіх Лук знаходзіўся маёнтак генерала ад інфантэрыі генерал-губернатара Фінляндыі Платона Ракасоўскага, які быў прадстаўніком далёкай галіны нашага роду. На падставе гэтых звестак месцам нараджэння К. Ракасоўскага і сталі Вялікія Лукі, дзе 1 ліпеня 1945 года быў устаноўлены яго бронзавы бюст (аўтар – народны мастак Беларусі Заір Азгур. – *С.Г.*).

Ці надаваў прадзед гэтай акалічнасці вялікае значэнне? Наўрад ці. Аднак у хуткім часе асабіста для яго справядлівасць была адноўлена: у 1949 годзе К. Ракасоўскага прызначылі міністрам абароны Польшчы, і яму зноў «трэба было нарадзіцца» ў Варшаве…

Няма сумненняў, што падчас пошуку месца для савецкай версіі нараджэння маршала ў яго біяграфіі былі выяўлены і факты, якія супярэчылі канонам камуністычнай ідэалогіі. Таму, каб не паўставала лішніх пытанняў, іх проста замоўчвалі. Дый сам К. Ракасоўскі, расказваючы пра сябе, не згадваў нязручныя радкі сваёй біяграфіі. Менавіта па гэтай прычыне ў ніводнай выдадзенай за савецкім часам кнізе пра

знакамітага военачальніка няма звестак пра тое, што ён паходзіў з некалі заможнага шляхецкага роду, у якім былі і паслы ў сейм Польшчы, і кашталяны польскіх гарадоў. Больш таго, яго прадзед, падпаручнік 2-га кавалерыйскага палка войска Варшаўскага герцагства Юзаф Ракасоўскі, прымаў удзел у Айчыннай вайне 1812 года на баку Напалеона, дайшоў з французамі да Масквы. А прабабуля палкаводца Гелена Халецкая была прымай-балерынай Варшаўскай оперы.

З паходжаннем бацькоў савецкага палкаводца таксама было не ўсё проста. Бацька на самай справе служыў інспектарам Варшаўскай чыгункі. Звалі яго Ксавер, і доўгі час у К. Ракасоўскага імя па бацьку было Ксаверавіч. Але на пачатку сваёй вайсковай кар'еры ён змяніў яго сам. Паводле афіцыйнай версіі, якой прытрымліваюцца і родныя маршала, з-за таго, што «яно гучала нязвыкла для рускага вуха і спараджала вялікую блытаніну: у дакументах пісалі яго па-рознаму – ад Савельевіча да Васільевіча». Маці Антаніна (паводле іншых звестак – Антаніда) да замужжа сапраўды была настаўніцай, выкладала рускую мову і літаратуру ў адной са школ Пінска, але паходзіла яна з мястэчка Целяханы, што на сучаснай Брэстчыне, з забяспечанай сям'і беларусаў Аўсяннікавых.

Дарэчы, не выключана, што продкі К. Ракасоўскага па мацярынскай лініі мелі і крыху іншае прозвішча. Сам маршал у 1965 годзе ўлісце целяханскаму краязнаўцу Анатолю Аляксандраву пра маці паведамляў наступнае: «Яе дзявочае прозвішча, наколькі я памятаю, было Аўсяннікава або Аўсянка».

– На жаль, беларуская старонка нашага радаводу пакуль не вывучана, – прызнаецца А. Ракасоўская. – Мы нічога не ведаем пра Аўсяннікавых, пра іх побыт у Целяханах. Магчыма, у пачатку Першай сусветнай вайны яны разам са шматлікімі бежанцамі пакінулі Беларусь і назад ужо не вярнуліся. З успамінаў прадзеда вядома толькі, што ў хуткім часе пасля смерці бацькі ён са старэйшай сястрой Марыяй застаўся ў Варшаве, а маці, узяўшы з сабой малодшую Гелену, паехала на сваю радзіму ў Целяханы, дзе ў 1911 годзе памерла і была пахавана на мясцовых могілках.

Між тым, як у свой час сведчыла сястра прадзеда Гелена Ракасоўская, яе брат «забраў ад мамы» многія рысы характару,



◀ Унтэр-афіцэр 5-га Каргапольскага драгунскага палка К. Ракасоўскі. 1916 год

дый падобны ён быў больш да яе, чым да бацькі. Праз усё жыццё сын пранёс і матчыну навуку. Прынамсі, яна вучыла маленькага Кастуся беларускім песням. Адкуль гэта вядома? У сакавіку 1942 года ў адным з абарончых баёў пад Масквой Канстанцін Канстанцінавіч быў цяжка паранены, і да яго ў шпіталь з Новасібірска прыехала жонка з дачкой. Яны вельмі моцна перажывалі, таму, каб падбадзёрыць родных, прадзед спяваў ім беларускія песні, чутыя ў маленстве ад маці…

## Настойлівы, валявы камандзір

Дзяцінства, як і юнацтва будучага маршала, не было бясхмарным. Калі яму споўнілася шэсць гадоў, не стала бацькі, а пасля ад'езду маці ў Целяханы хлопчык пазбавіўся і яе апекі. Спачатку яго са старэйшай сястрой забраў да сябе бацькаў брат Аляксандр. Але неўзабаве памёр і ён, і пляменнікам у дзядзькавай сям'і стала няўтульна. Сястру адправілі да цёткі ў Санкт-Пецярбург. Канстанціна ж у якасці каменячоса ўзяў да сябе ў майстэрню па вырабу помнікаў і выяў з каменю сваяк Стафан Высоцкі. Ён хацеў зрабіць юнака сваім кампаньёнам, але ў таго да гэтай справы душа не ляжала. Яго больш прыцягвала вольніца: паводле сцвярджэння праўнучкі, будучы савецкі маршал прымаў удзел у дэманстрацыях рабочых і студэнтаў,



▶ Канстанцін Ракасоўскі з жонкай Юліяй. 1923 год

за што быў арыштаваны і нават непрацяглы час знаходзіўся за кратамі знакамітай варшаўскай турмы «Павяк». А як пачалася Першая сусветная вайна, К. Ракасоўскі пайшоў добраахвотнікам на фронт. Ваяваў ён спачатку радавым, а затым – унтэрафіцэрам у 5-м Каргапольскім драгунскім палку 5-й кавалерыйскай дывізіі 12-й арміі. За храбрасць і адвагу быў адзначаны Георгіеўскім крыжам і трыма медалямі. Там жа ў войску пранікся бальшавіцкімі ідэямі і, як апантаны іх прыхільнік, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі перайшоў на службу ў Чырвоную гвардыю.

– Павяваць прадзеду ў Грамадзянскую вайну давялося спаўна, – расказвае А. Ракасоўская. – Ён не мінуў ніводнай прыступкі на сваёй кар'ернай лесвіцы – быў памочнікам начальніка чырвонагвардзейскага коннага атрада, камандаваў эскадронам, кавалерыйскімі дывізіёнам і палком. Змагаўся на Усходнім фронце з войскамі барона Р. фон Унгерна-Штэрнберга. Быў двойчы паранены. За баявыя заслугі ў гады Грамадзянскай вайны яго ўзнагародзілі двума ордэнамі Чырвонага Сцяга. Затым з 1921 па 1930 год, з перапынкамі на вучобу на кавалерыйскіх курсах удасканалення каманднага складу ў Ленінградзе і курсах начскладу пры Ваеннай акадэміі імя М. Фрунзе, а таксама на час працяглай камандзіроўкі ў Манголію ў якасці інструктара па стварэнні кавалерыі, служыў у Забайкаллі, камандаваў спачатку 3-й брыгадай 5-й Кубанскай кавалерыйскай дывізіі, а потым, калі дывізія была пераўтворана ў брыгаду, па ўласным жаданні пераведзены камандзірам 27-га кавалерыйскага палка. У 1929 годзе ўдзельнічаў у баях, выкліканых канфліктам вакол Кітайска-Усходняй чыгункі, за што атрымаў свой трэці ордэн Чырвонага Сцяга. Дарэчы, прадзед шэсць разоў адзначаўся гэтай узнагародай. Больш у яго было толькі ордэнаў Леніна – сем…

У 1930 годзе К. Ракасоўскі з Забайкалля быў пераведзены ў Беларусь. Яго прызначылі камандзірам 7-й Самарскай імя англійскага пралетарыяту кавалерыйскай дывізіі, якая дыслацыравалася ў Мінску і яго бліжэйшым наваколлі. Гэта было элітнае вайсковае злучэнне Беларускай ваеннай акругі, ім у свой час камандавалі такія вядомыя савецкія военачальнікі, як Гая Гай і Даніла Сердзіч. Відаць таму ў грамадскім жыцці тагачаснай Беларусі назначэнню новага камдыва і была нададзена вялікая ўвага – газета «Звязда» 16 сакавіка 1930 года ў матэрыяле «Новы камандзір 7-й Самарскай дывізіі» паведаміла сваім чытачам пра пераезд у Мінск К. Ракасоўскага, там жа былі змешчаны яго фотаздымак і біяграфія.

– Пра мінскі перыяд ваеннай кар'еры прадзеда інфармацыі не так і шмат, – гаворыць А. Ракасоўская. – Вядома, што ў яго падначаленні як камандзір 39-га кавалерыйскага палка праходзіў службу Г. Жукаў, з якім прадзед пазнаёміўся ў час сумеснай вучобы на Ленінградскіх кавалерыйскіх курсах удасканалення каманднага складу ў 1925 годзе. І менавіта па ініцыятыве Канстанціна Канстанцінавіча Георгій Канстанцінавіч быў павышаны на пасадзе: у красавіку 1930-га яго прызначылі камандзірам 2-й кавалерыйскай брыгады, што ўваходзіла ў склад «прадзедавай дывізіі». У сваю чаргу, камдыў К. Ракасоўскі непасрэдна падпарадкоўваўся камандуючаму 3-м кавалерыйскім корпусам імя Беларускай ССР С. Цімашэнку, які разгледзеў у ім дасведчанага военачальніка. «В дивизии имеются большие достижения во всех областях боевой подготовки… Дивизия имеет первенство по целому ряду состязаний окружного масштаба, а также первенство на всесоюзных состязаниях. Командный состав сколочен, и тов. Рокоссовский много работает над воспитанием комначсостава. Грамотный командир, учит

и воспитывает правильно. Настойчивый, волевой командир. Знает тактику и применение других родов оружия. Энергичен, четок и дисциплинирован. Хорошо организовывает и проводит занятия с начсоставом дивизии. Очень внимателен, никогда не вводит в заблуждение старших, справедлив. Должности комдива вполне соответствует», – адзначалася ў падпісанай С. Цімашэнкам службовай атэстацыі К. Ракасоўскага за 1931 год.

Служба прадзеда ў Беларускай ваеннай акрузе аказалася непрацяглай. У 1931 годзе Японія ўварвалася на тэрыторыю Маньчжурыі, разглядаючы яе як плацдарм для нападу на СССР. Гэта прымусіла савецкі ўрад прыняць меры для ўмацавання далёкаўсходніх рубяжоў краіны. У Забайкалле і Прымор'е ў тэрміновым парадку былі перадыслацыраваны новыя войскі, адначасова туды накіроўваліся і вопытныя камандзіры. У іх ліку быў К. Ракасоўскі – у лютым 1932 года ён стаў камандзірам 15-й Кубанскай кавалерыйскай дывізіі Забайкальскай групы войскаў…

## «Шпіён»

Сумна вядомыя падзеі 1937 года пакінулі чорны след і ў жыцці К. Ракасоўскага – будучага маршала закрануў малох сталінскіх рэпрэсій.

– Прадзеда арыштавалі ў жніўні 1937-га. Ён, будучы на той час камандзірам 5-га кавалерыйскага корпуса, які размяшчаўся ў Пскове, выехаў па службовых справах у штаб ваеннай акругі ў Ленінград, дзе і быў затрыманы органамі НКУС. Яго абвінавачвалі ў шпіянажы на карысць Польшчы (паляк жа па нацыянальнасці) і Японіі (ваяваў у Маньчжурыі, сустракаўся з начальнікам японскай ваеннай місіі ў Харбіне). Канстанціна Канстанцінавіча катавалі, але зламаць яго было немагчыма: ён быў чалавекам дужага целаскладу, фізічна вынослівым і моцным духам. Нават пасля бесчалавечных допытаў прадзед знаходзіў у сабе сілы на настаўленні сакамернікам: «Нічога не падпісваць, ні ў чым не прызнавацца. Калі нам давядзецца памерці, то з чыстым сумленнем». Асабіста ён так нічога і не падпісаў, не стаў ілжыва сведчыць і супраць іншых.

Шпіянаж на карысць Польшчы прыпісваўся следчымі К. Ракасоўскаму на падставе нібыта сведчанняў яго саратніка па Грамадзянскай вайне, «польскага агента» Адольфа Юшкевіча, які, будучы арыштаваным органамі НКУС, прызнаўся, што завербаваў прадзеда ў сваю агентурную сетку. Аднак Канстанцін Канстанцінавіч ведаў, што А. Юшкевіч, змагаючыся ў радах Чырвонай арміі, загінуў у 1920 годзе пры штурме Перакопа, і пра яго гераізм пісала ў адным з нумароў газета «Красная звезда». На пасяджэнні калегіі ваеннага суда прадзед і заявіў аб гэтым, падкрэсліўшы, што прызнáе сваю віну, калі Юшкевіча прывядуць на вочную стаўку. Што ж тычыцца сувязей з японцамі, то і тут следству не ўдалося нічога даказаць. Цяжка сказаць, якім чынам склаўся б далейшы лёс майго прадзеда – прыкладаў расстрэлу бязвінных савецкіх военачальнікаў, як і простых людзей, больш чым дастаткова, калі б за яго перад І. Сталіным не пахадайнічаў С. Цімашэнка. Сямён Канстанцінавіч у 1940 годзе, яшчэ да свайго прызначэння народным камісарам абароны СССР, займаючыся падборам начальніцкіх кадраў для моцна абяскроўленай Чырвонай арміі, успомніў пра добра вядомага яму па службе ў Мінску «настойлівага, валявога камандзіра» К. Ракасоўскага і папрасіў за яго. У выніку 22 сакавіка 1940 года вязня вызвалілі. Ён вярнуўся ў Чырвоную армію, атрымаў званне генерал-маёра.

Прадзед не любіў згадваць пра гэты перыяд свайго жыцця, і ў сям'і тэма ніколі не падымалася. Як і тэма яго ўзаемаадносін са Сталіным. «Бацька ўсіх народаў» быў для К. Ракасоўскага найперш Вярхоўным галоўнакамандуючым, якому ён, як чалавек ваенны, павінен быў падпарадкоўвацца. Некаторыя белетрысты, пішучы сёння пра іх узаемаадносіны, даводзяць, што Сталін прасіў прабачэння ў Канстанціна Канстанцінавіча за яго арышт і больш як два з паловай гады, праведзеныя за кратамі. На самай справе – гэта легенда. Тым не менш І. Сталін паважаў К. Ракасоўскага як военачальніка і, у адрозненне ад іншых савецкіх маршалаў, заўсёды называў Канстанцінам Канстанцінавічам. Прадзед цаніў гэта і паводзіў сябе адпаведным чынам. Не здрадзіў ён сваім ідэалам і пасля смерці Сталіна: у пачатку 1960-х М. Хрушчоў прапанаваў прадзеду напісаць пра Сталіна што-небудзь выкрывальна-негатыўнае, але той адмовіўся. «Нельга біць памерлага льва», – зазначыў ён пры гэтым…

## «Генерал кінжал»

К. Ракасоўскі ўдзельнічаў ва ўсіх найбуйнейшых бітвах Вялікай Айчыннай вайны. Сустрэў яе камандуючым 9-м механізаваным корпусам, які добра праявіў сябе на Паўднёва-Заходнім фронце ў вельмі цяжкіх баях пад Луцкам. Потым былі баі пад Смаленскам, дзе ён выступаў у ролі «пажарнага» – генералу вылучылі групу афіцэраў, радыёстанцыю і два аўтамабілі, а войскі ён павінен быў сабраць сам, спыняючы хаатычна адступаючыя вайсковыя падраздзяленні. І з пастаўленай перад ім задачай К. Ракасоўскі справіўся бліскуча. Злучэнне, сабранае ім, на працягу некаторага часу так і называлася – «група генерала Ракасоўскага», пакуль яму не была прысвоена назва 16-я армія. Дарэчы, ёй належыць немалая заслуга ў абароне Масквы. Але сапраўдны палкаводчы талент К. Ракасоўскага праявіўся ў бітве за Сталінград. У якасці камандуючага Данскім фронтам ён удзельнічаў у распрацоўцы і рэалізацыі аперацыі «Уран», вынікам якой сталі разгром і акружэнне фашысцкіх войскаў: быў узяты ў палон фельдмаршал Паўлюс, 24 нямецкія генералы, 2500 афіцэраў і 90 000 салдат.

І ў Курскай бітве, якая абумовіла карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны, генерал арміі К. Ракасоўскі – на той час ужо камандуючы Цэнтральным фронтам, праявіў сябе бліскучым стратэгам. Ён здолеў дакладна вызначыць участак, на якім немцы збіраліся нанесці свой галоўны ўдар, і стварыў там глыбокаэшаланаваную абарону. Наватарскім рашэннем стала артылерыйская контрпадрыхтоўка, праведзеная за 15–20 хвілін да пачатку нямецкага наступлення. Яна стала поўнай нечаканасцю для праціўніка і парушыла яго планы. Гітлераўцы панічна баяліся К. Ракасоўскага і далі яму мянушку «Генерал кінжал». Падставай для гэтага, па ўсім відаць, сталі сапраўды кінжальныя прарывы фашысцкай абароны войскамі, якімі камандаваў Канстанцін Канстанцінавіч.

▼ Камандуючы Цэнтральным фронтам генерал арміі К. Ракасоўскі і член Ваеннага савета фронту генерал-маёр К. Цялегін перад пачаткам бітвы на Курскай дузе. 1943 год



– Свайму баявому шляху ў гады Вялікай Айчыннай вайны прадзед прысвяціў кнігу ўспамінаў «Солдатский долг», – прадаўжае А. Ракасоўская. – Пісаў ён яе сам. Для яго гэта быў нялёгкі працэс. Здаралася, што па дваццаць разоў перапісваў тую ці іншую старонку, дабіваючыся найбольшай дакладнасці ў апісанні падзей. Кніга выйшла ў свет у 1968 годзе, пасля смерці яе аўтара. За некалькі дзён да гэтай сумнай для нашай сям'і падзеі прадзеду прынеслі тэкст «Солдатского долга» на ўзгадненне. На яго пытанне «Ці многа выкінулі?» прадстаўнік выдавецтва сарамліва апусціў вочы. На што Канстанцін Канстанцінавіч усміхнуўся і адразу падпісаў кнігу да друку.

А выкінулі цэнзары сапраўды шмат. І толькі ў 1990-я гады, дзякуючы рукапісу, які захаваўся, тэкст быў адноўлены, і ўсе апошнія перавыданні кнігі выходзілі ўжо без купюр. Дарэчы, выкрасленыя цэнзарамі тэксты вельмі цікавыя. Яны адлюстроўваюць нетрадыцыйны погляд на тыя ці іншыя падзеі і асабістыя адносіны да іх маршала К. Ракасоўскага.

Вось што, напрыклад, пісаў прадзед пра перадваенны час: «В приграничном районе КОВО (Кіеўскай асобай ваеннай акругі. – *С.Г.*) в то время происходили невероятные вещи. Через границу проходили граждане туда и обратно. К нам шли желающие перейти на жительство в СССР. От нас уходили не желающие оставаться в пределах Советского Союза. Правда, для прохождения через границу были определены пропускные пункты, но передвижение в приграничной полосе таило в себе много неприятностей для нас.

В этой же полосе свободно разъезжали на автомашинах переодетые в штатскую одежду немецкие офицеры, получившие

разрешение нашего правительства на розыск и эксгумацию якобы захороненных здесь немецких военнослужащих.

Нередки были случаи пролетов немецких самолетов. Стрелять по ним было категорически воспрещено. Характерным был случай, происшедший во время полевой поездки. В районе Ровно произвел вынужденную посадку немецкий самолет, который был задержан располагавшимися вблизи нашими солдатами. В самолете оказались четыре немецких офицера в кожаных пальто (без воинских знаков). Самолет был оборудован новейшей фотоаппаратурой, уничтожить которую немцам не удалось (не успели). На пленках были засняты мосты и железнодорожные узлы на киевском направлении. Обо всем этом было сообщено в Москву. Каким же было наше удивление, когда мы узнали, что распоряжением, последовавшим из Наркомата обороны, самолет с этим экипажем приказано было немедленно отпустить в сопровождении (до границы) двух наших истребителей. Вот так реагировал центр на явно враждебные действия немцев».

І нават такія, здавалася б, цалкам нейтральныя словы прадзеда пра пачатак Сталінградскай бітвы былі ўспрыняты цэнзарамі з падазрэннем: «И вот началось историческое сражение, повлекшее за собой окружение массы отборных немецко-фашистских войск. И если задолго до этого момента у противника имелась еще возможность спасти свои зарвавшиеся армии от разгрома путем своевременного и глубокого их отвода на запад, то теперь тупость и самоуверенность немецко-фашистского генералитета обрекла эти войска на гибель.

Теперь уже ничто не могло их спасти. В действие вступил умело и тщательно разработанный план Верховного Главнокомандования Советского Союза. Наступил и на нашей улице праздник – после Московской битвы вторично».

Магчыма, гэта будзе і нясціпла з майго боку, але адзначу, што я з вялікім задавальненнем кожны раз перачытваю мемуары прадзеда. Раю пазнаёміцца з імі і ўсім тым, каго цікавіць асоба маршала К. Ракасоўскага…

## Сталінскі Баграціён

– Калі можна так сказаць, любімым дзецішчам майго прадзеда была аперацыя



◀ К. Ракасоўскі на камандным пункце 1-га Беларускага фронту. 1944 год

пад кодавай назвай «Баграціён», у выніку якой летам 1944 года была поўнасцю вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Беларусь, – расказвае далей праўнучка маршала К. Ракасоўскага. – Ён ганарыўся тым, што меў непасрэднае дачыненне да яе, і заўсёды лічыў самай важнай ваеннай аперацыяй у сваім жыцці.

Як камандуючы 1-м Беларускім фронтам прадзед прымаў удзел у яе планаванні і адносна дзеянняў правага крыла свайго фронту настойваў на тым, каб на поўдні Беларусі былі адначасова нанесены два галоўныя ўдары па ворагу. Гэта яго прапанова не была падтрымана Стаўкай. Але К. Ракасоўскі не здаваўся. Галоўнакамандуючы І. Сталін тройчы выпраўляў прадзеда за дзверы кабінета, дзе праходзіла абмеркаванне стратэгіі аперацыі «Баграціён», – падумаць. Аднак камандуючы 1-м Беларускім фронтам свайго рашэння так і не змяніў. І тады Сталін вынес вердыкт: «Упэўненасць камандуючага – залог поспеху аперацыі».

У сваёй кнізе на гэты конт прадзед пісаў: «Почему я так настойчиво защищал решение о двух ударах? Дело в том, что местность на направлении Рогачев – Бобруйск позволяла в начальный период наступления сосредоточить там лишь силы 3-й и частично 48-й армий. Если этой группировке наших войск не оказать помощь на другом участке, противник будет в состоянии не допустить здесь прорыва своей обороны. В случае необходимости он для парирования угрозы имел бы возможность перебросить сюда силы с неатакованных участков. К этому необ-

ходимо добавить, что правый фланг 3-й армии упирался в район, занимаемый противником не только по западному, но и по восточному берегу Днепра. Это вынуждало нас принять надлежащие меры для обеспечения правого фланга армии и фронта. Удар 65-й и 28-й армий на левом берегу Березины в направлении Бобруйск, Осиповичи лишал противника возможности перебросить свои силы с этого участка против 3-й армии, и наоборот. Ударами на двух направлениях вводилась в сражение одновременно основная группировка сил правого крыла фронта, чего нельзя было достигнуть ударом на одном участке из-за его сравнительной ограниченности. Кроме того, успех, достигнутый на любом из этих участков, ставил противника в тяжелое положение, а войскам фронта обеспечивал успешное развитие операции». Дарэчы, і гэтыя радкі былі выкраслены цэнзарамі.

Зазначу, што некаторыя гісторыкі, спасылаючыся найперш на мемуары Г. Жукава, абвяргаюць ініцыятыву прадзеда наконт двух галоўных удараў 1-га Беларускага фронту, сцвярджаючы, што такое рашэнне было зацверджана І. Сталіным па прапанове Генштаба яшчэ да прыезду К. Ракасоўскага ў Стаўку. На гэты конт я заўсёды гавару, што схільная больш давяраць аўтару «Солдатского долга». Між тым, менавіта за паспяховы ўдзел 1-га Беларускага фронту ў аперацыі «Баграціён» Канстанціну Канстанцінавічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (другі раз К. Ракасоўскі быў яго ўдастоены пасля Вялікай Айчыннай вайны, 1 чэрвеня 1945 года, за ўмелае кіраванне войскамі 2-га Беларускага фронту ва Усходне-Прускай, Усходне-Памеранскай і Берлінскай аперацыях. – *С.Г.*), а маршалам ён стаў роўна праз тыдзень ад яе пачатку, 29 чэрвеня 1944 года. А пасля вызвалення Беларусі І. Сталін пачаў называць прадзеда «мой Баграціён»...

## Двойчы маршал

У канцы ліпеня 1944 года, пасля вызвалення Брэста, ваенныя шляхі-дарогі прывялі маршала К. Ракасоўскага ў родную для яго Польшчу. Праўда, на польскай тэрыторыі наступленне савецкіх войскаў было не такім імклівым, як у Беларусі. Тым не менш у пачатку верасня падраздзяленні 1-га Беларускага фронту наблізіліся да акупіраванай



▶ К. Ракасоўскі – міністр нацыянальнай абароны Польшчы. 1950-я гады

антыфашысцкім паўстаннем Варшавы. Паўстанцы чакалі, што з дня на дзень Чырвоная армія прыйдзе ім на дапамогу. Аднак іх спадзяванні не спраўдзіліся. Наступленне войскаў на чале з К. Ракасоўскім было спынена, а паўстанне ў выніку было задушана. Чаму так адбылося – прадмет шматгадовых спрэчак ваенных гісторыкаў.

– Прадзед вельмі перажываў, што не змог дапамагчы варшавянам, – сцвярджае А. Ракасоўская. – «Я в бинокль рассматривал город своей юности... Но видел одни развалины. Войска были измотаны, понесли, конечно, немалые потери. Необходимо было получить пополнение, подвезти большое количество боеприпасов, создать резервы. Без этого ни о каком наступлении через Вислу не могло быть и речи. Но мы помогали восставшим всем, чем могли: с самолетов сбрасывали им так необходимые нам самим продовольствие, медикаменты, боеприпасы. За две недели было сделано пять тысяч вылетов. Высадили через Вислу крупный десант, но он успеха не имел и, понеся значительные потери, отошел на восточный берег», – успамінаў ён пазней.

Той факт, што К. Ракасоўскі не прыйшоў на дапамогу варшавянам, палякі згадвалі маршалу да канца яго дзён. Ды і цяпер не-

катория польскія гісторыкі і палітыкі настойваюць: ён здрадзіў сваёй гістарычнай радзіме. І гэта нягледзячы на тое, што Канстанцін Канстанцінавіч унёс вялікі ўклад у аднаўленне пасляваеннай Польшчы. У 1949 годзе ён нечакана для сябе стаў міністрам нацыянальнай абароны Польскай Народнай Рэспублікі. На гэту пасаду яго накіраваў І. Сталін па просьбе тагачаснага польскага прэзідэнта Баляслава Берута. Сваё новае прызначэнне прадзед успрыняў са зблытанымі пачуццямі, бо разумеў неадназначнасць сітуацыі. Але як чалавек ваенны вымушаны быў падпарадкавацца загаду. За сем «польскіх» гадоў ён правёў вялікую работу па пераўзбраенні, рэарганізацыі Войска Польскага, павышэнні яго боегатоўнасці. Прадзед змог дабіцца таго, каб з СССР у Польшчу пастаўлялася найноўшая ваенная тэхніка. У выніку польская армія была ўзброена лепш, чым любая іншая з сацыялістычных краін. Пры гэтым на яго жыццё двойчы замахваліся польскія нацыяналісты. На шчасце, усё абышлося. У сакавіку 1956 года Баляслаў Берут памёр, і польскае кіраўніцтва ўзначаліў Уладзіслаў Гамулка. Ён пачаў барацьбу са «сталіністамі»: у іх лік трапіў і К. Ракасоўскі. Прадзеда адправілі ў адстаўку, забыўшыся пры гэтым пра ўсё, што ён зрабіў для станаўлення польскай арміі. Маршал Польшчы Канстанцін Ракасоўскі (гэта званне яму было прысвоена ў 1949 годзе, і ён быў адзіным военачальнікам, удастоеным савецкай маршальскай зоркі і польскай маршальскай булавы) пакінуў сваю гістарычную радзіму не хаваючы крыўды, і пасля гэтага ніколі туды не прыязджаў...

Дарэчы, з Польшчай у К. Ракасоўскага асацыіраваўся і яшчэ адзін не вельмі прыемны эпізод з яго ваеннай біяграфіі. У кастрычніку 1944 года аператыўная абстаноўка на франтах склалася такім чынам, што стаў відавочным прыярытэт цалкам размешчанага на польскай тэрыторыі 1-га Беларускага фронту ў наступленні на Берлін. І акурат у гэты час Стаўкай было прынята рашэнне аб пераводзе К. Ракасоўскага на 2-і Беларускі фронт, а на яго месца прызначылі Г. Жукава. Паводле прызнання Канстанціна Канстанцінавіча, гэта было для яго так нечакана, што з гарачкі ён нават спытаў у І. Сталіна, чым растлумачыць такую няміласць – перавод з галоўнага напрамку на другарадны?



▲ Маршалы К. Ракасоўскі і Г. Жукаў на Парадзе Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве. 1945 год

Атрыманы адказ – той участак, на які яго пераводзяць, не адносіцца да другарадных, а ўваходзіць у агульны заходні напрамак, не мог задаволіць маршала. Хутчэй за ўсё, ён добра разумеў прычыну такога рашэння – гонар узяцця Берліна аддаваўся не паляку па нацыянальнасці, а рускаму. Штосьці змяніць было немагчыма, і камандуючы 2-м Беларускім фронтам К. Ракасоўскі з гонарам выканаў свой салдацкі абавязак па разгроме фашыстаў ва Усходняй Памераніі. Але пасля гэтага пераназначэння яго не пакідала крыўда на Г. Жукава. Не знікла яна і пасля славутага Парада Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве: як вядома, парадам тады камандаваў менавіта К. Ракасоўскі, а прымаў яго Г. Жукаў.

## Сціплы чалавек

Вярнуўшыся ў СССР, 60-гадовы маршал К. Ракасоўскі не пакінуў вайсковую службу. Быў намеснікам міністра абароны краіны і займаў гэту пасаду да 1962 года, пакуль у яго не адбыўся вышэйзгаданы канфлікт з М. Хрушчовым. У выніку яго звольнілі без усялякіх тлумачэнняў: на другі дзень, як звычайна, ён прыехаў на службу, а ў яго кабінеце, у яго крэсле ўжо сядзеў маршал Маскаленка, які і паведаміў аб прынятым рашэнні. Пасля гэтага К. Ракасоўскі застаўся працаваць у Міністэрстве абароны гене-

ральным інспектарам Групы генеральных інспектараў.

– Пасля «ссылкі» ў інспектары Мінабароны ў прадзеда раптоўна з'явілася трохі больш вольнага часу, – працягвае свой аповед А. Ракасоўская. – І ён нарэшце змог прысвяціць сябе сям'і, заняцца любімымі справамі. Канстанцін Канстанцінавіч з ахвотай рыбачыў і хадзіў на паляванне, у апошнія гады жыцця шмат часу бавіў на дачы, якую, дарэчы, пабудаваў сам, з любоўю і пяшчотай даглядаў у садзе кожнае дрэўца. А яшчэ займаўся публіцыстыкай, пісаў артыкулы ў «Военно-исторический журнал», працаваў над сваім «Солдатским долгом».

Увогуле прадзед быў надзвычай сціплым чалавекам. На працу хадзіў пешшу, па дарозе заводзіў у школу ўнукаў. Будучы яшчэ міністрам нацыянальнай абароны Польшчы, ён неяк прыехаў адпачыць у санаторый, дзе яму далі асобны пакой у сталовай. Раніцай прадзед прыйшоў на сняданак і пытае: «А што, людзі не жадаюць са мной за адным сталом сядзець?» Затым, зразумеўшы, у чым прычына, узяў сваю талерку і пайшоў у агульную залу. І басейн ён таксама наведваў разам з усімі, не дазволіў зачыняць яго для іншых адпачывальнікаў на час свайго плавання. І ў гэтым быў увесь ён, маршал Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі.

Зразумела, што, як і ў любога чалавека, у прадзеда былі свае слабасці. Праўда, у апошні час што толькі яму ні прыпісваюць. У прыватнасці, раман з савецкай актрысай Валянцінай Сяровай і яго заляцанні да польскай актрысы Аляксандры Шчленскай. Гэта ўсяго толькі чуткі, якія не змог пацвердзіць ніхто з яго сяброў і знаёмых. На самай жа справе бравы афіцэр у зносінах з супрацьлеглым полам быў не вельмі рашучым. Са сваёй адзінай жонкай Юліяй Пятроўнай Барміной ён пазнаёміўся ў горадзе Троіцкасаўску (цяпер Кяхта. – *С.Г.*) у Бурацii амаль праз год пасля таго, як заўважыў яе на спектаклі ў мясцовым Доме афіцэраў. Чырвоны камандзір некалькі месяцаў ездзіў міма дома сваёй каханай, не адважваючыся прадставіцца, і калі б не ўмяшанне яго сябра, не было б у красавіку 1923 года вяселля і не нарадзілася б у 1925 годзе іх дачка Арыядна, мая бабуля, дарэчы, мая поўная цёзка.

На фронце Ракасоўскі сустрэў прыгажуню-ваендоктара Галіну Васільеўну Таланаву. У студзені 1945 года яна нарадзіла дзяўчынку. Як сапраўдны мужчына, Канстанцін Канстанцінавіч прызнаў яе дачкой, даў ёй сваё прозвішча і стараўся дапамагаць ёй усё жыццё. Але сваю сям'ю ён не пакінуў.

Памёр прадзед 3 жніўня 1968 года. Урна з яго прахам пахавана ў Крамлёўскай сцяне. Хоць сам Ракасоўскі хацеў знайсці свой вечны спачын не на Краснай плошчы, а назаўсёды застацца побач са сваёй каханай жонкай на Новадзявочых могілках. Але выйшла так як выйшла, бо родных ніхто не спытаў пра месца пахавання маршала, не пацікавіліся і яго завяшчаннем на гэты конт...

***

Арыядна Ракасоўская аказалася вельмі цікавай субяседніцай. Відавочна, што ведае жыццяпіс свайго славутага прадзеда да драбніц і ахвотна дзеліцца гэтымі ведамі. Пры развітанні яна зазначыла, што даволі часта бывае ў Беларусі і вельмі ўсцешана той увагай, якая нададзена ў нашай краіне ўшанаванню імя маршала К. Ракасоўскага і захаванню памяці аб ім. Спадзяецца яна, што, па сёлетняму прыкладу Масквы і Валгаграда, у Беларусі таксама з'явіцца велічны помнік яе прадзеду. А ён таго, без сумнення, заслугоўвае.

**Сяргей ГАЛОЎКА**
Фота з сямейнага архіва
А. Ракасоўскай

▼ К. Ракасоўскі на паляванні разам са сваім саслужыўцам па 1-м Беларускім фронце генерал-лейтэнантам К. Цалегіным. 1960-я гады

